тарскіх і навуковых арганізацый. Такія калектывы гублялі цікавасць да перспектыўнага, сусветнага ўзроўню тэхнікі, вызначэння прыярытэтных напрамкаў НТП. Іх прадукцыя і без таго знаходзіла збыт. У такім становішчы аказалася аб'яднанне «Гомсельмаш», якое больш дзесяці гадоў выпускала цяжкія, складаныя ў эксплуатацыі і ненадзейныя кормаўборачныя камбайны КСК-100, на што не рэагавалі сур'ёзна Гомельскі абком і гарком партыі.

Прычыны, як бачым, былі і ў недахопах партыйнага кіраўніцтва: нарастаў фармалізм і бюракратызм, адсутнічалі публічнасць, дзейсная крытыка і самакрытыка, не хапала творчай ініцыятывы ў многіх пярвічных арганізацыях і партыйных камітэтах. Ініцыятыва і дзелавітасць нярэдка падмяняліся адміністрацыйным умяшаннем, агульнымі заклікамі, абяцаннямі, а творчы пошук — спробамі ў новых умовах прымяняць устарэлыя формы і метады. Аналіз дакументаў паказвае, што ў гады дзесятай пяцігодкі на партыйных канферэнцыях, пленумах, пасяджэннях парткомаў становішча з развіццём НТП усё больш уяўлялася ў «ружовых» колерах, са спасылкай на станоўчыя прыклады. Аб недахопах у большасці выпадкаў гаварылася мімаходзь. Сапраўднае становішча глыбока не аналізавалася, упушчэнні звычайна спрабавалі растлумачыць аслабленнем увагі партарганізацый да гэтых праблем.

Так, складваўся механізм тармажэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, які не дазволіў партыйным арганізацыям Беларусі ў поўнай меры рэалізаваць творчы патэнцыял рабочага класа ў тэхнічным удасканаленні прамысловай вытворчасці.

[1] Гл.: Программа КПСС: Новая редакция. М., 1986. С. 24, 26.
[2] Гл.: Материалы XXVII съезда КПБ. Минск, 1971. С. 91, 93—95, 116, 118.
[3] Гл.: Сов. Белоруссия. 1977. 17 мая; За технический прогресс. 1978. 14 нояб.; там жа. 1980. 15 февр.
[4] Гл.: Материалы XXIX съезда КПБ. Минск, 1981. С. 15.
[5] Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г.: Статсборник. Минск, 1987. С. 46—49.
[6] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 35. С. 57.
[7] Гл.: Сов. Белоруссия. 1979. 21 нояб.
[8] Звязда 1979. 13 і 16 верасня; ПА Брэстскага АК КПБ. Ф. 1690, воп. 36, спр. 5, арк. 61—69; воп. 40, спр. 1, арк. 13—14.
[9] ПА Брэстскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 50, спр. 18, арк. 60, 61.

С. А. МАТОРАЎ

## ДЗЕЙНАСЦЬ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА ЭКАНАМІЧНАЙ АДУКАЦЫІ РАБОЧЫХ ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ (1976—1985)

Адным з важнейшых сродкаў выхавання ў кожнага працаўніка пачуцця гаспадара вытворчасці, фарміравання эканамічнага мыслення і сацыялістычнай прадпрымальнасці, павышэння дзелавітасці і арганізаванасці з'яўляецца сістэма эканамічнай адукацыі. На XXVII з'ездзе КПСС падкрэслівалася, што эканамічная адукацыя разам з палітычнай вучобай закліканы «узбройваць... працоўных уменнем палітычна стала мысліць і дзейнічаць, садзейнічаць распаўсюджанню і зацвярджэнню перадавых формаў арганізацыі працы і вытворчасці»[1]

У X пяцігодцы параўнаўча невялікая колькасць рабочых вывучала эканамічныя праблемы ў сістэме партыйнай і камсамольскай палітычнай вучобы, школах камуністычнай працы, пачатковых эканамічных школах. Так, на Мінскім заводзе халадзільнікаў яна складала ў 1977 — годзе 21,8 %; 1978 — 20,3; 1979 — 20,4 % колькасці рабочых. Дванаццаць эканамічных школ Мінскага завода «Ударнік» у 1979 годзе наведвалі 183 рабочыя, што складала 13 % рабочага калектыву прадпрыемства [2]. У сярэдніх і асабліва невялікіх вытворчых калектывах гэты паказчык быў яшчэ горшым, заняткі часта праходзілі на нізкім ідэйна-тэарэтычным і арганізацыйным узроўні.

Многія партыйныя арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў разглядвалі эканамічную адукацыю рабочых кадраў як штосьці другаснае ў сістэме ідэйна-выхаваўчай работы. На пасяджэнні партыйных бюро і камітэтаў, на партыйныя сходы рэдка выносілі пытанні, звязаныя з эканамічнай вучобай.

Становішча пачало мяняцца пасля апублікавання пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце партыйных арганізацый Башкірыі па ўзмацненню ролі эканамічнай адукацыі працоўных у павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС» (2 жніўня 1978 года) і пастановы ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб далейшым паляпшэнні эканамічнай адукацыі і выхавання працоўных» (17 чэрвеня 1982 года). У іх выразна вызначаўся асноўны змест вучобы, рэкамендавалася змяніць структуру вучэбных фарміраванняў, вылучалася патрабаванне павысіць адказнасць партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый за якасць і рэзультатыўнасць вучобы.

Аднак дзейнасць даных пастаноў у значнай меры зніжала тое, што задачы па ўдасканаленню эканамічнай вучобы не ўвязваліся з неабходнасцю радыкальных змен ва ўсім гаспадарчым механізме, развіццём самастойнасці і ініцыятывы вытворчых калектываў, эфектыўным выкарыстаннем сістэмы маральнага і матэрыяльнага стымулявання кожнага работніка за вынікі працы. У сувязі з гэтым ЦК КПБ спецыяльнай пастановай ад 4 студзеня 1980 года «Аб выкананні Наваполацкай гарадской партыйнай арганізацыяй патрабаванняў, якія вынікаюць з пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце партыйных арганізацый Башкірыі па ўзмацненню ролі эканамічнай адукацыі працоўных у павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС», патрабаваў ад партыйных арганізацый значна павысіць рэальную аддачу эканамічнай вучобы, выкарыстоўваць яе як дзейсны сродак павышэння якасці, зніжэння расходаў сыравіны, матэрыялаў, як важную састаўную частку сістэмы павышэння прафесіянальнай кваліфікацыі работнікаў [3].

Удасканаленню эканамічнай вучобы пачалі ўдзяляць больш увагі абласныя, гарадскія і раённыя камітэты партыі. Так, Першамайскі райком КПБ Віцебска сумесна з пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі распрацаваў на 1981—1985 гады перспектыўны план эканамічнай адукацыі працаўнікоў, які дазволіў ахапіць эканамічнай вучобай штогод больш за 25 тыс. чалавек, у асноўным рабочых прамысловых прадпрыемстваў. Бюро раённага камітэта партыі адобрыла ініцыятыву прапагандыстаў школ камуністычнай працы вытворчага аб'яднання «Маналіт» і панчошна-трыкатажнай фабрыкі КІМ С. Е. Харытонавай, Д. П. Пракоп'ева. Па прапанове С. Е. Харытонавай слухачы школы, рабочыя цэха № 5 ВА «Маналіт» прынялі абавязацельства за кошт памяншэння колькасці брыгады, авалодання перадавымі метадамі працы павысіць на сваім участку прадукцыйнасць працы на 2 % і дамагліся гэтага. Слухачы школы камуністычнай працы вязальнага цэха № 4 фабрыкі імя КІМ (прапагандыст Д. П. Пракоп'еў) абавязаліся павысіць прадукцыйнасць на 1 % [4].

Адной з форм партыйнага кіраўніцтва эканамічнай вучобай з'яўляліся саветы па эканамічнай адукацыі пры партыйных камітэтах, міністэрствах, ведамствах, у калектывах прамысловых прадпрыемстваў. Саветы займаліся рашэннем пытанняў, звязаных з практычным удасканаленнем навучання. На ўзроўні абкомаў, гаркомаў і райкомаў саветы ўзначальвалі сакратары адпаведных партыйных камітэтаў, на прадпрыемствах—адзін з намеснікаў дырэктара ці галоўны спецыяліст.

Плённа працаваў савет па эканамічнай адукацыі пры Гродзенскім абкоме КПБ. На яго пасяджэннях асноўная ўвага ўдзялялася пошуку шляхоў павышэння ролі эканамічнай адукацыі ў рашэнні вытворчых задач. Толькі ў 1983/1984 навучальным годзе савет разгледзеў пытанні: «Аб рабоце Навагрудскага раённага савета па эканамічнай адукацыі па ўзмацненні практычнай накіраванасці вучобы», «Аб рабоце Савета па эканамічнай адукацыі Ваўкавыскага завода ліцейнага абсталявання па мабілізацыі слухачоў на адшуканне рэзерваў скарачэння страт рабочага часу», «Аб рабоце савета па эканамічнай адукацыі Гродзенскага вытворчага аб'яднання «Нёман», аб удзеле прапагандыстаў у руху «Прапагандыст—пяцігодцы». Савет таксама аказваў вялікую метадычную дапамогу арганізатарам і прапагандыстам сістэмы эканамічнай вучобы [5].

У тых працоўных калектывах рэспублікі, дзе добра была пастаўлена эканамічная адукацыя, дасягаўся і пэўны эканамічны эфект. Так, у пачатку 1981 года слухачы школы камуністычнай працы з брыгады М. Ч. Рудкевіча Мінскага аўтамабільнага завода, прааналізаваўшы ў ходзе заняткаў рэзервы павышэння вытворчасці працы на сваіх рабочых месцах, выступілі з ініцыятывай «Заданне кожнага года пяцігодкі—меншай колькасцю працуючых». Гэта дазволіла пры скарачэнні колькасці з 40 да 35 чалавек паспяхова спраўляцца з планавымі заданнямі, а вытворчасць працы ўзра-

сла на 12,4 %. Ініцыятыва была падтрымана большасцю слухачоў школ камуністычнай працы аб'яднання «БелаўтаМАЗ». Эканамічная вучоба садзейнічала таксама пасляховаму правядзенню атэстацыі і рацыяналізацыі рабочых месц. Толькі з 1981 па 1984 год у цэхах і на ўчастках было скарочана 750 малаэфектыўных месц і вызвалена 950 чалавек [6].

У сістэме эканамічнай адукацыі Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі ў 1982/1983 навучальным годзе многія заняткі праходзілі непасрэдна на рабочых месцах слухачоў. У час заняткаў рабочыя знаёміліся з вопытам перадавікоў і наватараў вытворчасці. Практычная накіраванасць вучобы давала важкія вынікі. Рабочыя, ахопленыя рознымі формамі вучобы, падалі і ўкаранілі рацыяналізатарскіх прапаноў з эканамічным эфектам 44 тыс. руб. [7]

Аднак, нягледзячы на некаторыя зрухі ў пастаноўцы эканамічнага ўсенавуча, у калектывах прамысловых прадпрыемстваў у гады XI пяцігодкі, у цэлым ён не апраўдаў надзей. Адна з асноўных прычын — недасканаласць структуры эканамічнай адукацыі на асобных прадпрыемствах, дзе структура эканамічнай адукацыі была вельмі груваесткай. Рабочыя вывучалі эканамічную праблематыку ў сістэме партыйнай і камсамольскай вучобы, школах камуністычнай працы, народных універсітэтах, вучэбна-курсавых камбінатах. Часта вучэбныя фарміраванні камплектаваліся без уліку інтарэсаў прадпрыемства, спецыфікі яго вытворчай дзейнасці, а па ўказаннях зверху. Так, рабочыя-камуністы павінны былі займацца ў сістэме партыйнай вучобы, камсамольцы — камсамольскай, а беспартыйныя — у школах камуністычнай працы і пачатковых эканамічных школах. Гэта прыводзіла да таго, што члены працоўнага калектыву, які выконваў сумесную вытворчую праграму, штучна раздзяляліся па прыкмеце партыйнасці, вывучалі розныя курсы ў розных формах вучобы. Так, у цэху 06 Магілёўскага завода «Тэхнапрыбор» (820 работнікаў, з іх 77 членаў і кандыдатаў у члены КПСС) налічвалася 7 розных форм вучобы. Прычым у сістэме партыйнай і камсамольскай вучобы, як правіла, вывучаліся курсы светапогляднага характару, пытанні эканомікі, а пошуку шляхоў павышэння працоўнай актыўнасці слухачоў удзялялася мала ўвагі [8].

Не давала патрэбнай аддачы і навучанне рабочых у масавай форме эканамічнага ўсенавуча — школах камуністычнай працы, пачатковых эканамічных школах. Тэматыка, змест вучэбных праграм, вызначаліся не задачамі, якія стаялі перад тым ці іншым працоўным калектывам, а спушчанай зверху дырэктывай. Нярэдка яна наогул не была звязана з характарам вытворчай дзейнасці прадпрыемства. Так, у 1982/1983 1983/1984 навучальных гадах ва ўсіх школах камуністычнай працы (19 школ, 399 слухачоў), у 14 эканамічных школах камсамольскай вучобы (299 чал.) Лідскай абутковай фабрыкі вывучаўся курс «Харчовая праграма СССР»; на Віцебскім тэлевізійным заводзе аналагічны курс вывучаўся ў 46 (1828 слухачоў) з 74 школ камуністычнай працы [9]. Работа эканамічных школ пакутавала па-ранейшаму асветніцтвам, шаблоннасцю, руцінёрствам. У гэтым пераконваюць даныя сацыялагічных даследаванняў, праведзеных на прамысловых прадпрыемствах Віцебскай вобласці (1982/1983 навучальны год) Акадэміяй грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Толькі 15,3 % апытаных ведалі планавыя заданні сваіх прадпрыемстваў па росту прадукцыйнасці, 18 % — па павелічэнню аб'ёмаў вытворчасці, 14,7 % — па зніжэнню сабекошту прадукцыі. Нават на такіх перадавых прадпрыемствах, як Аршанскі льнокамбінат, Віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка, толькі 1,8 % заняткаў звязваліся з удасканаленнем гасразліку; 1,2 — удасканаленнем аплаты працы, сацыялістычнага спаборніцтва; 13,2 — з пошукам шляхоў эканоміі сыравіны і матэрыялаў; 14,4 % — з аналізам якасці выпускаемай прадукцыі [10]. У многіх школах камуністычнай працы вопыт перадавікоў і наватараў вытворчасці вывучаўся павярхоўна, не ставілася задача практычнага авалодання і прымянення яго слухачом на сваім рабочым месцы.

Нізкая эфектыўнасць эканамічнай вучобы ў многім вызначалася і тым, што адміністрацыя, прафсаюзная арганізацыі прадпрыемстваў, на якіх былі ўскладзены функцыі планавання, арганізацыі вучэбнага працэсу, часта не выконвалі іх, а перакладвалі на кабінеты палітычнай асветы пры партыйных камітэтах. На XIV пленуме Магілёўскага АК КПБ (ліпень 1983 года) адзначалася, што на многіх прадпрыемствах няма эканамічных кабінетаў, не створана матэрыяльная база вучобы, фармальна лічацца саветы па эканамічнай адукацыі [11]. Падобная сітуацыя была характэрна не толькі для Магілёўскай вобласці, але і для рэспублікі ў цэлым.

Рэзультатыўнасць эканамічнай адукацыі ў многім залежыць ад стылю

і метадаў кіраўніцтва гэтым важным участкам ідэйна-выхаваўчай работы партыйнымі арганізацыямі. Часта ў ім пераважаў чысцейшы фармалізм. Да прыкладу, у 1982 годзе Ленінскі РК КПБ. Гродна распрацаваў мерапрыемствы па выкананні пастановы ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб далейшым паляпшэнні эканамічнай адукацыі і выхавання працоўных». Аднак гэтыя мерапрыемствы зводзіліся да простага калькавання рашэнняў вышэйстаячых партыйных інстанцый. Падобныя недахопы былі характэрны для большасці раённых, гарадскіх камітэтаў партыі, парткомаў аб'яднанняў і прадпрыемстваў рэспублікі.

Правядзенне эканамічнага эксперымента ў шэрагу галін прамысловасці, рашэнні красавіцкага (1985) Пленума ЦК КПСС, які патрабаваў узмацнення перабудовы гаспадарчага механізма і ўкаранення гасразліку, садзейнічалі актыўнаму пошуку новых падыходаў да пастаноўкі эканамічнай адукацыі. У 1985 годзе на 13 прадпрыемствах Віцебскай, Брэсцкай, Мінскай абласцей фарміраванне структурных звенняў палітычнай і эканамічнай вучобы было праведзена па вытворчаму прынцыпу. Адзінай формай вучобы, арганізаванай для ўсіх рабочых цэхаў, участкаў, гасразліковых брыгад, былі ахоплены і камуністы, і беспартыйныя. Школы інтэнсіфікацыі эканомікі ствараліся на базе школ камуністычнай працы, шматлікіх курсаў павышэння кваліфікацыі. Вопыт стварэння такіх школ поўнасцю сябе апраўдаў. Ён быў ухвалены XXX з'ездам Кампартыі Беларусі і рэкамендаваны для шырокага распаўсюджання.

Дзейнасць партыйных арганізацый рэспублікі па пастаноўцы эканамічнага ўсенавуча ў калектывах прамысловасці ў 1976—1985 гады сведчыць, што нягледзячы на асобныя станоўчыя рэзультаты, яго велізарны патэнцыял не быў поўнасцю раскрыты і выкарыстаны. Сур'ёзныя недахопы ў пастаноўцы эканамічнай адукацыі нельга растлумачыць толькі недаглядам ў партыйным кіраўніцтве ім. Ва ўмовах зжыўшай сябе сістэмы кіравання народнай гаспадаркай, страты работнікамі пачуцця гаспадара вытворчасці нават самае добрае пачынанне не магло даць доўгачасовага эфекту. У многіх рабочых не было імкнення да атрымання эканамічных ведаў, паколькі яны не адчувалі ад гэтага рэальнай карысці.

Для паляпшэння якасці эканамічнай вучобы неабходна дамагчыся таго, каб эканамічныя веды былі звязаны з задачамі паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Неабходна перабудова эканамічнай адукацыі, якая б закранула арганізацыю, змест, методыку навучальна-выхаваўчага працэсу. Шляхі гэтай перабудовы вызначаны пастановай ЦК КПСС «Аб перабудове сістэмы палітычнай і эканамічнай вучобы працоўных» (верасень 1987 года). Ставіцца мэта зрабіць эканамічную вучобу гнуткай, рухомай, дынамічна развіваючайся сістэмай, якая аператыўна адгукаецца на вылучаныя жыццём задачы, з'яўляецца дзейсным сродкам актывізацыі чалавечага фактару ў рашэнні складаных сацыяльна-эканамічных праблем грамадства [13].

[1] Материалы XXVII съезда КПСС. М., 1986. С. 118.

[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 125, спр. 56, арк. 135; АА Белсаўпрофа. Ф. 1. воп. 11, спр. 2277, арк. 11.

[3] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 134, спр. 17, арк. 2—6.

[4] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 42, воп. 63, спр. 3, арк. 14.

[5] См.: Советская Белоруссия. 1984. 23 марта.

[6] Там жа. 1985. 26 марта.

[7] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 42, воп. 61, спр. 3, арк. 104—105.

[8] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 5887, воп. 1, спр. 39, арк. 104—105.

[9] ПА Гродненскага АК КПБ. Ф. 240, воп. 1, спр. 283, арк. 23; ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 10025, воп. 14, спр. 2, арк. 35.

[10] ПА Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 158, спр. 4, арк. 15; Коммунист Белоруссии. 1984. № 12. С. 23.

[11] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 9, воп. 172, спр. 8, арк. 9.

[12] ПА Гродненскага АК КПБ. Ф. 6181, воп. 6, спр. 8, арк. 132—134; Ф. 6176, воп 6, спр. 8, арк. 83—85; ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 2951, воп. 5, спр. 7, арк. 85—89.

[13] См.: Политическое образование. 1987. № 10. С. 4.